# IX МІЖНАРОДНАЯ НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ Ў МДЛУ

8 красавіка 2010 г. у Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце адбылася чарговая, IX Міжнародная навуковая канферэнцыя "Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць", прысвечаная 65-й гадавіне Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

Адкрываючы канферэнцыю, рэктар універсітэта Н.П. Баранава зазначыла, што ў цяперашні час значнасць Вялікай Перамогі набывае асаблівую актуальнасць, абуджаючы вялікі не толькі навуковы, але і грамадскі інтарэс: чым далей адыходзяць ад нас падзеі ваенных гадоў, тым глыбей раскрываюцца таямніцы гісторыі вайны, тым больш сур'ёзна, старанна і адказна павінна праводзіцца вывучэнне і аналіз фактаў ваеннага мінулага. Ад імя кіраўніцтва ВНУ ўдзельнікам канферэнцыі былі выказаны прывітальныя словы і пажаданні паспяховай і плённай працы.

Канферэнцыя працавала ў фармаце пленарных пасяджэнняў. Першае праходзіла пад назвай "Вялікая Перамога: подзвіг, гісторыя, памяць". Прадстаўленыя навуковыя даклады і паведамленні сведчылі, што цікавасць беларускіх, латышскіх і расійскіх гісторыкаў да розных аспектаў ваеннага мінулага, упісанага ў народны летапіс пасляваеннай памяці, не згасае да гэтага часу. Дакладчыкі закранулі даволі шырокую панараму гістарычных праблем ад удзелу воінаў-беларусаў у баях за Берлін (Б. Далгатовіч) да Сцяга Перамогі і яго тайнаў (У. Якубоўскі). Я. Бараноўскі раскрыў некаторыя пытанні кадравай палітыкі ў Беларусі напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны. І. Варанкова прапанавала малавядомыя факты аб эвакуацыі дзяцей з Мінску ў першыя дні Вялікай Айчыннай вайны. А. Дакунова звярнулася да паказу форм барацьбы савецкіх ваеннапалонных на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг. А. Зельскі распавёў пра лёс асобных савецкіх ваеннапалонных у нямецкіх лагерах на тэрыторыі Гомельскай вобласці. Д. Козел асвятліў гісторыю арганізацыі радыёсувязі з партызанскімі фарміраваннямі Беларусі цягам часу з 1941 г. па красавік 1943 г. І. Лапіна паказала асаблівасці пракурорскага нагляду ў ваенны час. А. Ціманава пазнаёміла з вынікамі аналізу асноўных напрамкаў дзейнасці Наркамата юстыцыі на вызваленай тэрыторыі Беларусі (восень 1943–вясна 1945). Г. Хадасевіч прадставіла некаторыя адметнасці нямецкай акупацыі ў Карэліцкім раёне. Н. Царук распавяла аб інтэрнацыянальным характары польскага руху супраціўлення ў гады Другой сусветнай вайны. А. Цымбал аналізаваў палітыку нямецкай акупацыйнай адміністрацыі і беларускай калабарацыі ў адносінах да праваслаўнай царквы ў 1941–1944 гг. Г. Якаўлева вызначала на аснове сучасных гістарыяграфічных крыніц характар нацысцкага акупацыйнага рэжыму на тэрыторыі Віцебшчыны ў 1941–1944 гг. А. Шаркоў вынес на разгляд мерапрыемствы па прыёму савецкіх грамадзян, якія вярталіся на радзіму з тэрыторыі дзяржаў Заходняй Еўропы (1944–1946). Л. Шкуцько і Г. Шкуцько знаёмілі ўдзельнікаў канферэнцыі з гісторыяй брацкай дапамогі народаў Савецкага Саюза ў аднаўленні эканомікі БССР у 1943–1945 гг. У. Коршук распавёў аб вызваленні Беларусі ў 1943–1944 гг.

Асаблівы інтарэс у ўдзельнікаў выклікаў даклад Э. Екабсона на тэму "Беларусы ў Латвіі ў часы нямецка-фашысцкай акупацыі (1941–1944)". Як вынікае з дакументаў, у перыяд нямецкай акупацыі ў Латвіі беларуская адукацыя і культура перажылі другі па велічыні росквіт у гісторыі пасля перыяду 1920-х – пачатку 1930-х гг. у Латвійскай Рэспубліцы. Гэты перыяд быў параўнальна кароткім і вызначаўся рэалізацыяй германскай акупацыйнай палітыкі. Асновай яе было жаданне, па-першае, паменшыць значнасць польскага фактару, па-другое, палегчыць сабе кантроль над насельніцтвам акупаванай Латвіі, асабліва латышамі. Для гэтага выкарыстоўваўся спосаб "падзяляй і валодай" ва ўсіх магчымых варыянтах, штучна дзелячы і ствараючы канфліктныя сітуацыі паміж рознымі нацыянальнасцямі і нават дыялектнымі групамі на занятых тэрыторыях. Менавіта таму немцы быццам бы добразычліва ставіліся да беларускага руху і, напрыклад, да латгальцаў, культывуючы іх раздзел з латышамі.

Аб зніклых мастацкіх скарбах у расійскім горадзе Вялікі Ноўгарад, дзе цягам вайны было разбурана 98 % гарадскіх пабудоў, распавядала Ю. Кантор у дакладзе "Дзейнасць групы "Остланд" аператыўнага штаба рэйхсляйтэра Розенберга". З 19 жніўня 1941 г. (дата захопу немцамі абласнога цэнтра Гомель. – *С.Н.*) і да канца студзеня 1944 г. (Гомель вызвалены 26 лістапада 1943 г. – *С.Н.*) горад знаходзіўся пад нямецкай акупацыяй. За час акупацыі былі знішчаны сусветна вядомыя шэдэўры старажытнарускага каменнага дойлідства (цэрквы, манастыры, фартыфікацыйныя збудаванні) і больш познія архітэктурныя помнікі. На думку расійскай даследчыцы, у гэтай гісторыі існуе не менш жахлівая старонка – беззваротна зніклыя мастацкія каштоўнасці: іконы, кнігі, творы жывапіснага і дэкаратыўна-прыкладнага мастацтва, царкоўныя прылады. Эвакуіраваць значную частку культурных каштоўнасцей проста не паспелі. Дакладная колькасць страчанага не ўстаноўлена да гэтай пары, яго лёс па цяперашні час невядомы. Як мяркуе гісторык, частковы адказ на гэта пытанне можна знайсці пры даследаванні дзейнасці групы "Остланд" аператыўнага штаба рэйхсляйтэра Розенберга.

Дзейнасць знішчальных і загараджальных атрадаў Чырвонай Арміі на тэрыторыі Беларусі ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны – тэма даклада маскоўскага гісторыка У. Федзюніна. У дачыненні да знішчальных атрадаў аўтар зазначае, што, сфарміраваныя на добраахвотнай аснове з мясцовага насельніцтва ў дапамогу Чырвонай Арміі як часовыя паўваенныя злучэнні, яны з цягам часу выраслі да палкоў, дзейнічалі ў самых цяжкіх умовах пачатковага перыяду Вялікай Айчыннай вайны. У іх склад уваходзілі мужчыны, жанчыны і падлеткі, якія імкнуліся любымі сродкамі на справе дапамагчы Чырвонай Арміі разграміць ворага. Частка з іх улілася ў склад вайсковых часцей, а некаторыя сталі ядром партызанскіх атрадаў у тыле ворага. На думку гісторыка, загараджальныя атрады Чырвонай Арміі былі выкліканы суровай неабходнасцю ў самым пачатку вайны і сталі адной з важнейшых ваенна-палітычных мер вышэйшага савецкага палітычнага і ваеннага кіраўніцтва на этапе вядзення прыгранічных бітваў. Толькі з цягам часу яны перайшлі ў падпарадкаванне НКУС.

На пасяджэнні прагучала апошняе выступленне аднаго з тых, хто восем гадоў таму стаяў ля вытокаў закладвання традыцыі па рэгулярным правядзенні навуковай канферэнцыі "Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць", дацэнта кафедры гісторыі і беларусазнаўства МДЛУ, кандыдата гістарычных навук В. Курганава на тэму "Пусть помнит мир спасенный!".

Другое пленарнае пасяджэнне "Разняволеная памяць: вопыт прымусовай працы насельніцтва на акупаванай тэрыторыі Беларусі (1941–1944) мела сваю адметнасць, сутнасць якой вызначаў удзел у абмеркаванні вузкіх пытанняў трох нямецкіх і трох беларускіх гісторыкаў. Пасяджэнне пачалося з выступлення нямецкага даследчыка Д. Поля аб прымусовай працы ўсходніх рабочых у Трэцім рэйху як аб'екце сучасных гістарычных даследаванняў. Гісторыкам зроблены аналіз агульнага стану сучаснай нямецкай гістарыяграфіі ў аспекце даследавання прымусовай працы ў Германскім рэйху і на акупаванай усходняй тэрыторыі. Зроблены вывад аб важнасці інтэнсіфікацыі кантактаў і пашырэнні фармату супрацоўніцтва гісторыкаў Еўропы, паколькі з мэтай вывучэння праблемы гістарычная навука не можа развівацца выключна ў нацыянальным кантэксце. Гэтае становішча павінен змяніць шэраг праектаў, падтрыманых нямецкім фондам "Памяць, адказнасць і будучыня".

Агульную карціну прыцягнення мясцовага насельніцтва апаратам германскіх акупацыйных улад да прымусовай працы на тэрыторыі акругі Баранавічы ў 1941–1944 гг. ствараў на аснове значнай дакументальнай базы А. Бракель. Гісторык прыводзіць лічбавыя падлікі агульнай колькасці мясцовага насельніцтва, якое цягам трох гадоў акупацыі працавала на немцаў. У акрузе Баранавічы да канца 1943 г. былі зарэгістраваны больш за 134 тыс. чалавек, з якіх звыш 95 тыс. працавалі ў сельскай гаспадарцы. На гэтым фоне лічба ў 17 тыс. беларускіх грамадзян, вывезеных на работы ў рэйх, пераканаўча сведчыць аб тым, што непараўнальна больш мясцовых жыхароў рабілі на немцаў на розных мясцовых прадпрыемствах і ў сельскай гаспадарцы. Пры гэтым, як адзначае даследчык, лёс мясцовага насельніцтва не турбаваў ні акруговы апарат нямецкіх улад, ні найвышэйшыя інстанцыі ў Берліне.

Розныя катэгорыі савецкіх грамадзян, прыцягнутых да прымусовай працы на акупаванай тэрыторыі Данбаса, ляжалі ў цэнтры ўвагі даследчыцы з Бохума Т. Пентэр. Паводле статыстычных звестак, з Данецкага басейна ў рэйх у якасці "усходніх рабочых" былі вывезены 330 тыс. чалавек, што складала амаль палову ад тых, хто быў вывезены эканамічнай інспекцыяй "Поўдзень" са студзеня 1942 г. да верасня 1943 г. Пры гэтым больш як палову з вывезеных на прымусовыя работы складалі жанчыны. На думку даследчыцы, калі гісторыя прымусовай працы мясцовага насельніцтва на акупаванай тэрыторыі больш не з'яўляецца "белай плямай", дык гэта нельга сказаць у дачыненні да рэпатрыянтаў, хто пасля завяршэння вайны вярнуўся ў Данецкі вугальны басейн. На сёння застаецца амаль недаследаванай гістарычнай навукай і пытанне аб ролі несвабоднай рабочай сілы ў адбудове гаспадаркі СССР.

На думку загадчыка аддзела ваеннай гісторыі і міждзяржаўных адносін Інстытута гісторыі НАН Беларусі А. Літвіна, у падобным палажэнні знаходзіцца і беларуская гістарычная навука, якая даследуе беларускае насельніцтва, што ў гады германскай акупацыі прыцягвалася да прымусовай працы на тэрыторыі Беларусі. Як адзначыў гісторык, толькі на этапе суверэнітэту айчыннымі гісторыкамі праароблена значная праца па зборы, сістэматызацыі і асэнсаванні сутнасці такой з’явы, як “беларускія остарбайтары”, агульная колькасць якіх складае амаль 400 тыс. чалавек. Аднак па цяперашні час айчынным гісторыкам не ўдалося даць адказ адносна той часткі беларускіх грамадзян, якія прыцягваліся да прымусовай працы германскай ваеннай уладай у перыяд акупацыі Беларусі ў 1941–1944 гг.

На гэта пытанне ўпершыню ў беларускай гістарычнай навуцы адказвае С. Новікаў, які намаляваў для ўдзельнікаў канферэнцыі агульную карціну аб колькасных маштабах прыцягнення мясцовага насельніцтва да прымусовай працы на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Аналіз дакументальных крыніц, выяўленых у архіўных фондах Беларусі, Германіі, Латвіі і Расіі, пераконвае ў тым, што ў гады германскай акупацыі Беларусі тут на розных работах былі заняты звыш 1,5 млн чалавек. Гісторык заключае, што шматлікія аспекты ваенна-эканамічнай гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны пакуль адносяцца да ліку маладаследаваных. У гэтым выпадку размова павінна весціся пра больш дэталёвае вывучэнне гісторыі працоўнай паўсядзённасці, напісанай жыхарамі беларускіх гарадоў, пасёлкаў і вёсак, рабочымі прамысловых прадпрыемстваў, занятых у сельскай гаспадарцы, служачымі, а таксама жанчынамі, ваеннапалоннымі, вязнямі лагераў і гета, дзецьмі: гэта значыць усімі, хто з’яўляўся фактычным суб’ектам гісторыі працоўнай паўсядзённасці на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг.

Матэрыялы другога пасяджэння ўвайшлі ў зборнік навуковых артыкулаў, выдадзены асобна (Мінск, 2010) пад назвай “Разняволеная памяць. Прымусовая праца беларускіх грамадзян на акупаванай тэрыторыі Беларусі (1941–1944 гг.)” Некаторыя дакументальныя матэрыялы па гэтай тэме былі прадстаўлены на фотавыставе “Разняволеная памяць”, якая ладзілася ў Гістарычнай майстэрні г. Мінска з 5 па 25 красавіка 2010 г., а таксама была афармлена ў дзень правядзення канферэнцыі ў Цэнтры беларускай мовы і культуры МДЛУ.

Трэцяе пленарнае пасяджэнне “Ваенная гісторыя Беларусі і Германіі: трансфармацыя поглядаў” ахапіла шматаспектную тэматыку беларуска-германскіх і германска-беларускіх палітычных, эканамічных і культурных адносін. На пасяджэнні прагучалі даклады аб дэфініцыях Халакосту (Я. Басін); беларусах у лагерах для перамешчаных асоб у Заходняй Германіі (1945 – пачатак 1950-х гг.); кадравай палітыцы нацыстаў у дачыненні да навучальных устаноў у Беларусі (1941–1944) (І. Валынкін); аб’яднаннях і саюзах германскіх плямён у старажытнасці (У. Грыгор’еў); баявых дзеяннях

1-й паветранай арміі пры ўступленні савецкіх войск на тэрыторыю Усходняй Прусіі (16–27 кастрычніка 1944 гг.) (Д. Дзякаў); пра рускіх у Латвіі у перыяд нацысцкай акупацыі (К. Зеліс); аб знаходжанні Альберта Кесельрынга ў Беларусі ў Расіі ў 1941 г. (Э. Іофе); перыядычных выданнях нацысцкіх акупацыйных улад як крыніцы па гісторыі паўсядзённасці на тэрыторыі Віцебшчыны (А. Корсак); становішчы інвалідаў на тэрыторыі Беларусі ў час германскай акупацыі 1941–1944 гг. паводле матэрыялаў Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці (В. Матох); беларуска-германскіх узаемаадносінах у 1918 г. (В. Мазец); асобе Вільгельма Кнорына і праблеме Германіі (Д. Марціновіч); ваенна-палітычных кантактах СССР і Германіі ў 20–30-я гг. ХХ ст. (Д. Мігун); беларускай народнай самапомачы (М. Нікіцін); косаўскім крызісе ў люстэрку партыйных дыскусій "Саюза 90/зялёныя" (І. Новікава); вывазе культурных каштоўнасцей фашысцкімі захопнікамі з тэрыторыі еўрапейскіх краін і Беларусі ў гады Другой сусветнай вайны (Т. Ойстрах-Дзямідава); германскім фактары ў асэнсаванні прычын стварэння Літоўска-Беларускай ССР (А. Рэзнік); пісьмах салдат вермахта і вайне вачыма нямецкага салдата (Л. Скрабіна); укладзе ў даследаванне персаніфікаванага аспекту антыгерманскага супраціву на акупаванай тэрыторыі БССР у 1941–1944 гг. (М. Стралец); санітарна-супрацьэпідэмічных мерапрыемствах у Беларусі ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе (Я. Цішчанка і С. Сіткевіч); Вялікай Айчыннай вайне ў амерыканскім перыядычным друку 1941–1945 гг. (А. Цобкала); дзейнасці беларускіх нацыянальных арганізацый у Адэсе ў перыяд аўстра-германскай акупацыі 1918 г. (М. Шчаўлінскі).

Адным з пытанняў, якое выклікала надзвычайны інтарэс, стала тэма паведамлення ад'юнкта факультэта лінгвістыкі Варшаўскага ўніверсітэта доктара Ю. Грыбоўскага "Стварэнне і дзейнасць Партыі беларускіх нацыяналістаў на тэрыторыі Трэцяга рэйха, або Да пытання пра існаванне беларускага нацыянальнага падполля падчас Другой сусветнай вайны". У выніку аналізу вядомых і новых дакументаў аўтару ўдалося прыйсці да высновы адносна таго, што спроба стварэння незалежніцкага падполля ў выглядзе ПБН была, па сутнасці, "папяровым" праектам. Нягледзячы на тое, што ў чэрвені 1941 г. надзеі на атрыманне дзяржаўнасці з рук кіраўніцтва Трэцяга рэйха ператварыліся ў марныя летуценні, беларускія дзеячы лічылі патрэбным надалей супрацоўнічаць з акупантамі, выкарыстоўваючы хоць якую магчымасць уплыву на падзеі на Беларусі праз удзел у арганізацыі і функцыянаванні цывільнага і паліцэйскага апарату пад нямецкай акупацыяй.

Польская даследчыца М. Ялоза прапанавала матэрыял на тэму "Ліга беларускіх палітычных вязняў нямецкіх канцэнтрацыйных лагераў: да гісторыі існавання малавядомай беларускай арганізацыі ў Заходняй Германіі ў пасляваенныя гады". Паводле матэрыялаў, з канца вайны заходнія землі Нямеччыны з'яўляліся найбуйнейшым асяродкам беларускай эміграцыі, дзе знаходзіліся лагеры для цывільных бежанцаў з Усходняй Еўропы. Лагеры ствараліся паводле нацыянальнай прыкметы. На думку даследчыцы, побач

з тузінам вядомых беларускіх структур і арганізацый існавала Ліга беларускіх палітычных вязняў нямецкіх канцэнтрацыйных лагераў. Арганізацыя бярэ свой пачатак у 1946 г., калі ў складзе Цэнтральнага міжнароднага саюзу палітычных вязняў была створана беларуская секцыя. Аб яе кароткай гісторыі вядзе расповедзь даследчыца.

Рэзюмуючы тэарэтычныя напрацоўкі, выяўленыя ў ходзе абмеркавання матэрыялаў, удзельнікі сустрэчы адзначылі важнасць працягу далейшага выкарыстання розных падыходаў у справе дасягнення кансенсусу ў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі. Беларускай ваенна-гістарычнай навуцы патрэбна сістэма гістарычных ведаў, адэкватных сусветнаму ўзроўню і выклікам найноўшага часу.

Вопыт па правядзенні канферэнцыі паказвае, што вырашэнне асобных праблем магчыма толькі праз сталае супрацоўніцтва гісторыкаў розных краін. У выніку такога супрацоўніцтва значна пашыраецца не толькі навуковая, але і інфармацыйная прастора, максімальна поўнае выкарыстанне якой на цяперашні час з'яўляецца адной з прыярытэтных задач удзельнікаў сустрэчы ў МДЛУ. Падсумоўваючы арганізацыйна-практычныя вынікі працы канферэнцыі, яе ўдзельнікі адзначылі станоўчую тэндэнцыю пашырэння кола даследчыкаў, чые навуковыя інтарэсы закранаюць ваенную гісторыю Беларусі.

С.Я. Новікаў

*Паступіла ў рэдакцыю 24.01.11*